УДК 347.961(476)(091)+94(476)"1917/1991

***У.М. Ангельскі***

# РАЗВІЦЦЁ ІНСТЫТУТА НАТАРЫЯТА Ў ЗАКОНЕ БССР «АБ ДЗЯРЖАЎНЫМ НАТАРЫЯЦЕ» АД 30 КРАСАВІКА 1974 ГОДА

Артыкул прысвечаны характарыстыцы Закона БССР «Аб дзяржаўным натарыяце» ад 30 красавіка 1974 г., выяўленню агульнага і асаблівага ў параўнанні з Законам СССР «Аб дзяржаўным натарыяце» ад 19 ліпеня 1973 г. і Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР «Аб дзяржаўным натарыяце» ад 12 студзеня 1967 г. Аналізуецца прававы і сацыяльны статус дзяржаўных натарыусаў, колькасць, структура і якасць выкананых натарыяльных дзеянняў як напярэдадні прыняцця Закона БССР «Аб дзяржаўным натарыяце», так і праз шаснаццаць гадоў дзеяння адзначанага акта заканадаўства.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь у арт. 2 замацавала, што «чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з’яўляюцца вышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы» [1]. У прававой сістэме беларускай дзяржавы асабліваее месца ў абароне правоў і законных інтарэсаў грамадзян і юрыдычных асоб, дзяржаўных інтарэсаў належыць натарыяту. У Рэспубліцы Беларусь у 2011 г. паслугі насельніцтву аказвала 815 дзяржаўных натарыусаў у складзе 208 дзяржаўных натарыяльных кантор і 47 прыватных натарыусаў. Колькасць выкананых натарыяльных дзеянняў у 2011 г. склала больш за 1,2 млрд. У дзяржаўны бюджэт паступіла звыш 37 млрд беларускіх рублёў дзяржаўнай пошліны [2, с. 8].

Натарыят Рэспублікі Беларусь прайшоў складаны і супярэчлівы гістарычны шлях да набыцця сучаснага вобліку. Гісторыка-прававыя аспекты развіцця інстытута натарыята неабходна вывучаць для таго, каб атрыманыя веды прымяняць для ўдасканалення дзеючага заканадаўства аб натарыяце і натарыяльнай дзейнасці. Дзяржаўны натарыят БССР выконваў ролю праваахоўнага інстытута, прызванага забяспечваць правы і законныя інтарэсы фізічных і юрыдычных асоб, дзяржаўныя інтарэсы, умацоўваць правапарадак і законнасць шляхам правільнага, аднастайнага і своечасовага выканання натарыяльных дзеянняў, накіраваных на юрыдычнае замацаванне правоў і абавязкаў, папярэджваць магчымыя парушэнні правоў у будучым, прыдаваць дакументам доказальную сілу і публічнасць.

Напярэдадні прыняцця Закона БССР «Аб дзяржаўным натарыяце» ў складзе 76 дзяржаўных натарыяльных кантор працавала 89 дзяржаўных натарыусаў: 13 мужчын і 76 жанчын. 65 (73%) дзяржаўных натарыусаў мелі вышэйшую юрыдычную адукацыю, 10 (11%) – сярэднюю спецыяльную юрыдычную адукацыю, 3 мелі курсавую падрыхтоўку, 2 не мелі юрыдычнай адукацыі (вучыліся завочна на юрыдычным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У.І. Леніна і ў Вышэйшым юрыдычным завочным інстытуце). 48 натарыусаў мелі стаж працы ў органах юстыцыі звыш 10 гадоў. Па партыйна-грамадскай прыналежнасці: 31 – члены Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і кандыдаты ў члены Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, 9 – члены Усесаюзнага Ленінскага камуністычнага саюза моладзі. Дзяржаўнымі натарыусамі БССР у 1974 г. было выканана 468 849 натарыяльных дзеянняў, у тым ліку засведчана дакументаў для дзеяння за мяжой – 311. Структура выкананых натарыяльных дзеянняў наступная: засведчана дагавораў аб прадастаўленні ў бестэрміновае карыстанне зямельных участкаў для жыллёвага будаўніцтва – 5 919; засведчана дагавораў аб адчужэнні пабудоў – 5 208; накладзена забарон на пабудовы па паведамленнях і дагавораў

---

Навуковы кіраўнік – Т.І. Доўнар, доктар юрыдычных навук, прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

закладу – 1 564; выдадзена выканаўчых надпісаў – 33 509; засведчана завяшчанняў – 5 055; выдадзена пасведчанняў аб праве на спадчыну – 13 447; засведчана вернасці копій дакументаў – 340 161; выканана іншых натарыяльных дзеянняў – 63 991. За выкананне натарыяльных дзеянняў у бюджэт рэспублікі паступіла 937 422 рублеў; за аказанне паслуг пры выкананні натарыяльных дзеянняў атрымана 31 605 рублеў [3, л. 23].

У сярэдзіне 1970-х гг. уладамі БССР была зроблена спроба змяніць падыход да дзяржаўнага натарыята шляхам пераўтварэння яго з «тэхнічнага» органа ў дзяржаўны орган, здольны абараніць правы грамадзян і арганізацый. Такую мэту прапаноўвалася дасягнуць шляхам павышэння патрабаванняў да дзяржаўных натарыусаў і адпаведна памера заработнай платы, павелічэння колькасці дзяржаўных натарыяльных кантор і паляпшэння іх матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, удасканалення рэжыму працы. У выніку натарыяльныя паслугі павінны былі стаць больш даступнымі і якаснымі, а прэстыж прафесіі натарыуса ўзрасці.

Вырашальную ролю ў гэтым працэсе адыграў Закон БССР «Аб дзяржаўным натарыяце», які быў прыняты Вярхоўным Саветам БССР 30 красавіка 1974 г. – першы закон ў гісторыі натарыята БССР [4]. Да гэтага часу грамадскія адносіны ў натарыяльнай сферы рэгулявалі палажэнні, якія зацвярджаліся ўказамі Вярхоўнага Савета. Закон БССР «Аб дзяржаўным натарыяце» са змяненнямі і дапаўненнямі дзейнічаў да 2000 г.

Прычынамі распрацоўкі і прыняцця закона БССР «Аб дзяржаўным натарыяце» сталі прыняцце закона СССР «Аб дзяржаўным натарыяце» і неабходнасць прывесці заканадаўства аб дзяржаўным натарыяце ў адпаведнасць з грамадскімі адносінамі. Тагачасны міністр юстыцыі БССР А.А. Здановіч ў сваім дакладзе на пасяджэнні Вярхоўнага Савета БССР падкрэсліваў, што «неабходнасць прыняцця закона аб дзяржаўным натарыяце вызвана тым, што ў нас зроблена вялікая праца па ўмацаванні эканомікі, развіцці грамадскіх адносін, пашырыўся аб'ём і характар прававых адносін, якія патрабуюць дзяржаўнага рэгулявання. Узнік шэраг новых грамадскіх праваадносін, і дзейнасць натарыята павінна адказваць сучасным умовам жыцця нашага грамадства» [5, л. 316].

Закон СССР «Аб дзяржаўным натарыяце», які абумовіў прыняцце Закона БССР «Аб дзяржаўным натарыяце», быў прыняты 19 ліпеня 1973 г. [6]. Гэта быў першы ў гісторыі заканадаўства СССР закон, прысвечаны дзяржаўнаму натарыяту. Гэты закон утрымліваў, па-першае, імператыўныя нормы, што дазволіла вызначыць абавязковыя патрабаванні да дзяржаўнага натарыята на саюзным узроўні; па-другое – дыспазітыўныя нормы, дзякуючы якім саюзныя рэспублікі пры распрацоўцы рэспубліканскіх законаў маглі самастойна вырашаць шэраг пытанняў, улічваючы пры гэтым мясцовыя традыцыі і асаблівасці.

Закон СССР «Аб дзяржаўным натарыяце» складаўся з 32 артыкулаў, у той час як Закон БССР «Аб дзяржаўным натарыяце» – з 88 артыкулаў. У тым выпадку, калі нормы Закона СССР «Аб дзяржаўным натарыяце» мелі канструкцыю накшталт «устанаўліваецца заканадаўствам саюзнай рэспублікі», то Законам БССР «Аб дзяржаўным натарыяце» такія нормы замацоўваліся. Напрыклад, згодна арт. 5 Закона СССР «Аб дзяржаным натарыяце», на пасады дзяржаўных натарыусаў прызначаюцца грамадзяне СССР, якія маюць вышэйшую юрыдычную адукацыю. У асобных выпадках, прадугледжаных заканадаўствам саюзных рэспублік, пасады дзяржаўных натарыусаў маглі займаць асобы, якія не мелі вышэйшай юрыдычнай адукацыі. Менавіта такі выпадак быў прадугледжаны Законам БССР «Аб дзяржаўным натарыяце». Так, згодна арт. 5 адзначанага закона, на пасады дзяржаўных натарыусаў маглі прызначацца грамадзяне СССР, якія мелі вышэйшую юрыдычную адукацыю. У асобных выпадках на пасады дзяржаўных натарыусаў маглі прызначацца асобы, якія не мелі вышэйшай юрыдычнай адукацыі, пры ўмове, што яны не менш трох гадоў працавалі па спецыяльнасці юрыста.

Закон БССР «Аб дзяржаўным натарыяце» ўтрымліваў шэраг артыкулаў і нават цэлы раздзел – «Правілы выканання асобных відаў натарыяльных дзеянняў», якіх у Законе СССР «Аб дзяржаўным натарыяце» не было. Гэта звязана з тым, што ў кожнай саюзнай рэспубліцы, у тым ліку і БССР, былі выпрацаваны свае правілы выканання натарыяльных дзеянняў, а перад саюзным заканадаўцам пры прыняцці саюзнага закона не было пастаўлена мэты ўніфікаваць адзначаныя правілы. Такім чынам, Закон БССР «Аб дзяржаўным натарыяце» не толькі паўтараў нормы саюзнага закона «Аб дзяржаўным натарыяце», але і дэталізаваў, дапаўняў іх.

Распрацоўшчыкі Закона БССР «Аб дзяржаўным натарыяце» ў першую чаргу абапіраліся не на Закон СССР «Аб дзяржаўным натарыяце», а на Палажэнне аб дзяржаўным натарыяце БССР, якое было зацверждана ўказам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 12 студзеня 1967 г., і на вопыт яго прымянення [7]. Закон БССР «Аб дзяржаўным натарыяце» ў адрозненне ад Палажэння аб дзяржаўным натарыяце БССР удакладніў задачы дзяржаўнага натарыята. Так, згодна арт. 1 Закона БССР «Аб дзяржаўным натарыяце» задачамі дзяржаўнага натарыята з’яўляліся ахова сацыялістычнай маёмасці, правоў і законных інтарэсаў грамадзян, дзяржаўных устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый, калгасаў і іншых кааператыўных і грамадскіх арганізацый, умацаванне сацыялістычнай законнасці і правапарадку, папярэджанне правапарушэнняў шляхам правільнага і своечасовага засведчання дагавораў і іншых здзелак, афармлення спадчынных правоў, здзяйсненне выканаўчых надпісаў і іншых натарыяльных дзеянняў.

Закон БССР «Аб дзяржаўным натарыяце» ўпершыню надзяліў правам выконваць натарыяльныя дзеянні дзяржаўныя натарыяльныя канторы, выканаўчыя камітэты гарадскіх, пасялковых, сельскіх Саветаў народных дэпутатаў і пэўнае кола службовых асоб. Пры гэтым адзначаны закон замацаваў такія ж патрабаванні да жадаючых стаць дзяржаўнымі натарыусамі, як і Палажэнне аб дзяржаўным натарыяце БССР. Больш таго, Закон БССР «Аб дзяржаўным натарыяце» (ў адрозненне ад папярэдняга акта заканадаўства аб дзяржаўным натарыяце) не ўтрымліваў нормы, згодна якой назначэнне на пасаду дзяржаўнага натарыуса адбывалася, як правіла, пасля праходжання стажыроўкі. Гэта не азначае, што праходжанне стажыроўкі не з’яўлялася абавязковай працэдурай для жадаючых стаць дзяржаўнымі натарыусамі.

У Законе БССР «Аб дзяржаўным натарыяце», як і ў Палажэнні аб дзяржаўным натарыяце БССР, знайшлі замацаванне прынцыпы натарыяльнай дзейнасці: незалежнасць, тайна натарыяльнага дзеяння, законнасць, бесстароннасць, садзейнічанне грамадзянам і арганізацыям у рэалізацыі іх правоў і абароне законных інтарэсаў. Закон БССР «Аб дзяржаўным натарыяце» замацаваў такія ж віды натарыяльных дзеянняў, як і папярэдняе Палажэнне аб дзяржаўным натарыяце БССР, а кампетэнцыю выканаўчых камітэтаў Саветаў дэпутатаў працоўных значна пашырыў.

Адзначаны закон удакладніў, што дзяржаўныя натарыусы і іншыя службовыя асобы, якія выконваюць натарыяльныя дзеянні, у выпадку выяўлення пры выкананні натарыяльных дзеянняў парушэнняў законнасці грамадзянамі ці асобнымі службовымі асобамі, абавязаны паведаміць аб гэтым установам, прадпрыемствам, арганізацыям альбо пракурору. Палажэнне аб дзяржаўным натарыяце БССР не замацоўвала магчымасці звярнуцца пры адзначаных абставінах да пракурора. Такая норма акта заканадаўства дазволіла ўстанавіць сувязь паміж дзяржаўным натарыятам і пракуратурай, што павінна было садзейнічаць ўмацаванню сацыялістычнай законнасці.

Як Палажэнне аб дзяржаўным натарыяце БССР, так і Закон БССР «Аб дзяржаўным натарыяце» ўтрымлівалі норму, згодна якой натарыяльныя дзеянні павінны быць выкананы ў дзень прад’яўлення ўсіх неабходных для гэтага дакументаў і ўплаты дзяржаўнай пошліны. Палажэнне аб дзяржаўным натарыяце БССР замацавала толькі дзве падставы для адкладання выканання натарыяльнага дзеяння: 1) у выпадку выпатраба-

вання дадатковых звестак ці дакументаў ад службовых асоб дзяржаўных устаноў, прадпрыемстваў і арганізацый; 2) пры неабходнасці накіравання дакументаў на экспертызу. Акрамя вышэйадзначаных падстаў, Закон БССР «Аб дзяржаўным натарыяце» утрымліваў новыя. Першая – у выпадку атрымання ад суда паведамлення аб паступленні заявы зацікаўленай асобы, якая аспрэчвае права ці факт, аб засведчанні якога просіць іншая зацікаўленая асоба; другая – у выпадку атрымання дзяржаўным натарыусам ці службовай асобай, якая выконвае натарыяльныя дзеянні, заявы ад зацікаўленай асобы, якая жадае звярнуцца ў суд для аспрэчвання права ці факта, аб засведчанні якога просіць іншая зацікаўленая асоба.

Як Закон БССР «Аб дзяржаўным натарыяце», так і Палажэнне аб дзяржаўным натарыяце БССР утрымлівалі норму, згодна якой дзяржаўны натарыус ці службовая асоба, якая выконвае натарыяльныя дзеянні, па просьбе асобы, якой адказана ў выкананні натарыяльнага дзеяння, павінна выкласці прычыны адказа ў пісьмовай форме і растлумачыць парадак яго абскарджання. У Законе БССР «Аб дзяржаўным натарыяце» ўпершыню былі замацаваны падставы для адказу ў выкананні натарыяльных дзеянняў, прычым іх спіс не быў вычарпальным. Патрэбна адзначыць, што такі падыход не садзейнічаў належнай ахове правоў грамадзян і арганізацый пры выкананні натарыяльных дзеянняў.

Адзначаны закон упершыню замацаваў два віды скаргаў. Першы від – скаргі, звязаныя з неправільным выкананнем натарыяльных дзеянняў альбо з адказам у выкананні натарыяльнага дзеяння. Такія скаргі разглядаліся судом па месцы знаходжання дзяржаўнай натарыяльнай канторы, выканаўчага камітэта гарадскога, пасялковага, сельскага Савета дэпутатаў працоўных. Другі від – скаргі, не звязаныя з выкананнем натарыяльных дзеянняў (напрыклад, парушэнне тэрмінаў выканання натарыяльных дзеянняў ці непрытрымліванне ўстаноўленых гадзін прыёма). Такія скаргі разглядаліся аддзеламі юстыцыі выканаўчых камітэтаў абласных Саветаў дэпутатаў працоўных, Міністэрствам юстыцыі БССР, Міністэрствам юстыцыі СССР.

У Законе БССР «Аб дзяржаўным натарыяце» былі замацаваны новыя нормы, якія рэгулявалі правілы выканання асобных відаў натарыяльных дзеянняў. Так, упершыню быў устаноўлены парадак натарыяльнага засведчання такіх здзелак, як здзелкі аб адчужэнні маёмасці, якая падлягала рэгістрацыі; дагавораў аб прадастаўленні зямельных участкаў для будаўніцтва жылых дамоў на праве асабістай уласнасці.

Закон БССР «Аб дзяржаўным натарыяце» адыграў значную ролю ва ўдасканаленні прававога рэгулявання грамадскіх адносін у натарыяльнай сферы. Менавіта гэты акт заканадаўства быў узяты за аснову пры распрацоўцы Закона Рэспублікі Беларусь «Аб натарыяце і натарыяльнай дзейнасці». Больш таго, многія нормы прававога акта аб дзяржаўным натарыяце, дзейнасць якіх была праверана часам, былі перанесены ў дзеючы натарыяльны закон Рэспублікі Беларусь без перапрацоўкі.

Праз шаснаццаць год дзеяння Закона БССР «Аб дзяржаўным натарыяце» ў складзе 179 дзяржаўных натарыяльных кантор працавала 247 дзяржаўных натарыусаў: 221 (89,5%) дзяржаўны натарыус меў вышэйшую юрыдычную адукацыю, 10 (4%) – сярэднюю спецыяльную юрыдычную адукацыю, 16 (6,5%) мелі незакончаную вышэйшую юрыдычную адукацыю. 43 дзяржаўныя натарыусы мелі стаж працы ў органах юстыцыі менш за 3 гады, 48 – звыш 10 гадоў. 23 дзяржаўныя натарыусы мелі ўзрост звыш 50 гадоў, з якіх 15 дасягнулі пенсійнага ўзросту [8, л. 1]. Такім чынам, павялічылася колькасць дзяржаўных натарыяльных кантор, дзяржаўных натарыусаў і значна павысіўся ўзровень іх юрыдычнай адукаванасці.

Дзяржаўнымі натарыусамі БССР у 1990 г. было выканана 1 108 455 натарыяльных дзеянняў, у тым ліку засведчана дакументаў для дзеяння за мяжой – 1 666. Структура выкананых натарыяльных дзеянняў наступная: засведчана дагавораў аб прадас-

таўленні ў бестэрміновае карыстанне зямельных участкаў для жыллёвага будаўніцтва – 5 202; засведчана дагавораў аб адчужэнні пабудоў – 17 594; засведчана завяшчанняў – 17 739; выдадзена пасведчанняў аб праве на спадчыну – 61 222; засведчана вернасці копій дакументаў – 669 488; выканана іншых натарыяльных дзеянняў – 309 810. За выкананне натарыяльных дзеянняў у бюджэт сыскана – 23 871 516 рублеў [8, л. 1].

Дзякуючы прыняццю Закона БССР «Аб дзяржаўным натарыяце» за шаснаццацігадовы перыяд яго дзеяння адбыліся істотныя змены. Так, павялічыўся працэнт дзяржаўных натарыусаў, якія мелі вышэйшую юрыдычную адукацыю (з 73 да 89,5). Павысіўся прафесійны ўзровень дзяржаўных натарыусаў і адначасова ўзрос прэстыж іх прафесіі. Пасада дзяржаўнага натарыуса стала больш прывабнай для маладога спецыяліста з вышэйшай юрыдычнай адукацыяй. Акрамя таго, больш чым у два разы павялічылася колькасць дзяржаўных натарыяльных кантор (з 76 да 179) і амаль у тры разы колькасць дзяржаўных натарыусаў (з 89 да 247), а таксама іншых работнікаў дзяржаўных натарыяльных кантор, што дазволіла зрабіць натарыяльныя паслугі больш даступнымі для грамадзян і арганізацый. У сувязі з гэтым больш чым у два разы ўзрасла колькасць натарыяльных дзеянняў (з 468 849 да 1 108 455).

У агульнай структуры натарыяльных дзеянняў зменшыўся працэнт такога «простага» натарыяльнага дзеяння, як сведчанне вернасці копій дакументаў: з 72,5 да 60,3. Павялічылася колькасць «складаных» натарыяльных дзеянняў, напрыклад, выдача пасведчанняў аб праве на спадчыну (з 13 447 да 61 222). Павялічылася колькасць менш запатрабаваных натарыяльных дзеянняў, напрыклад, выкананне перакладаў і сведчанне вернасці перакладаў і копій дакументаў; сведчанне знаходжання грамадзяніна ў жывых; прыняцце ў дэпазіт для перадачы па прыналежнасці грашовых сум і каштоўных папер; здзяйсненне пратэстаў вэксаляў; пасведчанне неаплаты чэкаў; прыняцце на захаванне дакументаў; выдача пасведчанняў аб праве ўласнасці на долю агульнай маёмасці мужа і жонкі, набытай на працягу шлюбу.

Такім чынам, прыняцце Закона БССР «Аб дзяржаўным натарыяце» ад 30 красавіка 1974 г. і яго практычная дзейнасць спрыялі ўмацаванню аўтарытэта дзяржаўнага натарыята і росту даверу да яго як з боку насельніцтва, так і арганізацый. Дзяржаўны натарыят БССР заняў належнае месца сярод дзяржаўных органаў, якія абаранялі правы грамадзян і арганізацый, і выканаў задачы, пастаўленыя перад ім дзяржавай і грамадствам.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Конституция Респ. Беларусь 1994 г. (с изм. и доп., принятыми на респ. референдумах 24 нояб. 1996 г. и 17 окт. 2004 г.). – Минск : Амалфея, 2005. – 48 с.

2. Работа органов юстиции в 2011 г. // Юстиция Беларуси. – 2012. – № 2. – С. 3–5.

3. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Фонд 99. Министерство юстиции Белорусской ССР. – Опись 8, 1983–1990. – Дело 322. Объяснительные записки Минюста БССР, облюстов к полугодовым статотчетам о работе нотариальных контор, работе органов загса и отдела за 1974 год на 118 л.

4. О государственном нотариате : Закон Белорусской ССР, 30 апр. 1974 г. // Собр. законов, указов Президиума Верховного Совета Белорусской ССР, постановлений и распоряжений Совета Министров Белорусской ССР. – 1974. – № 13. – с. 224.

5. НАРБ. – Фонд. 968. Верховный Совет Респ. Беларусь. – Оп. 1, 1938–1996. – Д. 983. Стенограмма 7-ой сессии Верховного Совета БССР восьмого созыва от 30 апр. 1974 г. о проекте Закона Белорусской ССР «О государственном нотариате»; утверждении указов Президиума Верховного Совета БССР на 105 л.

6. О государственном нотариате : Закон СССР, 19 июля 1973 г. // Ведамасці Вярхоўнага Савета СССР. – 1973. – № 30. – Арт. 393.

7. Об утверждении Положения о Государственном нотариате Белорусской ССР : Указ Президиума Верховного Совета Белорусской ССР, 12 янв. 1967 г. // Собр. законов, указов Президиума Верховного Совета Белорусской ССР, постановлений и распоряжений Совета Министров Белорусской ССР. – 1967. – № 2. – Арт. 11.

8. НАРБ. – Фонд 99. – Оп. 8. – Д. 1516. Сводный статотчет министерства, отчеты областных и Минского городского управлений юстиции о работе нотариальных контор за 1990 г. и объяснительные записки к ним на 73 л.

***Anhelski U.M.* Development of Institute of Notary in Law of BSSR «About State Notary» dated from April 30, 1974**

This article is devoted to development of institute of notary in Law «About State Notary» dated from April 30, 1974, identifying the general and particular in comparison with the Law of USSR «About State Notary» dated from July 19, 1973, and the Statute of BSSR «About State Notary», dated from 12 January 1967. Legal and social status of state notaries is analyzed. It is paid attention to number of state notarial bureau, structure and quality of notarial acts before the enactment of the Law of BSSR «About State Notary» and after sixteen years action of this act of legislation.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 22.03.2013